Устрашымся ж, палюбёныя, гэта пачуўшы і зразумеўшы колькі і якіх дабротаў, прыгатаваных Богам, і якое нясцерпнае асуджэнне на муку. Парупімся ж пры дапамозе сумленнай і шчодрай міласціны атрымаць спадчыну вечных і невымоўных дабротаў, пазбегнуўшы выпрабавання бясконцымі мукамі. Нават калі б і не ведалі за сабой грахоў, то і тады было б нягодным не аказваць міласці адзін аднаму. Паколькі ж мы вінаватыя ў многіх зграшэннях, то міласцінай адрынем іх ад сябе.

Таксама і іншых запаведзяў пастараемся трымацца, таму што не можам дазволіць сабе, паспадзяваўшыся на адну толькі міласціну, аддацца аб'ядзенню, і п'янству, і распусце, і браць ліхву, і абражаць гневам, і зайздросціць, і нагаворваць, і пляткарыць, і іншым грахом аддавацца. Такім чынам, усё, чаму мы праз святое Евангелле навучыліся, таго і трымацца павінныя. Гэтак і я, настаўлены айцом нашым Янам Златавустам, упрошваю вас, айцы, і братове, і сынове: будзем захоўваць запаведзі Божыя. Не можам мы нудзіцца і наракаць на іх, бо запаведзі Ягоныя – не цяжкія...

**З блаславення настаяцеля Свята-Міхайлаўскага прыхода**
**протаіерэя Ігара Галакава**
***Укладальнік: Алесь Спіцын***
**Дата выпуску: 3 сакавіка 2019 г.**



# МІХАЙЛАЎСКІ ЛІСТОК

САКАВІК, 2019

Свята-Міхайлаўскі прыход г. Мінска, вул. Янкоўскага, 2

## НЯДЗЕЛЯ АБ СТРАШНЫМ СУДЗЕ



**Слова сярод святых айца нашага Кірыла Тураўскага ў нядзелю мясапустную аб другім прышэсці Хрыста**

Палюбёныя браты! Збярыцеся і паслухайце разумна і ўважліва страшныя і грозныя словы, на збавенне ўсяго роду чалавечага сказаныя, каб пабачыць суд, які прагне прыйсці на ўвесь свет! Уявім сабе, якое шчасце будзе тым, хто захаваў чыста і беззаганна запаведзі Гасподнія, і які праклён прымуць тыя, хто занядбаў сваё жыццё і не захаваў словаў Хрыстовых! Бо збярэцца як на кірмаш ці на відовішча увесь род чалавечы. І не толькі хрысціяне там стануць, але і не датычныя святой веры. Таму прыгатуемся не толькі паслухаць, але і прынесці плод выканання абвешчанай запаведзі. Сапраўды і сапраўды парупімся ды пастараемся, бо запаведзі ўзвядуць нас на вяршыню дабрадзейнасці і карысныя будуць для душаў нашых. <...>

“Збяруцца, – кажа Ён – усе народы, гэта значыць, увесь род чалавечы, і раздзеліць Ён іх, як пастух авечак”. Цяпер не падзеленыя яны, але змяшаныя – праведныя з грэшнымі. Раздзеленыя ж яны будуць з падрабязным выпрабаваннем, і тое, дзе хто апынецца, пакажа ўсю ягоную сутнасць.

Таксама і ў найменнях вобраз кожнага паказаны, бо адных Ён называе казламі, а іншых – авечкамі. У адных паказвае няплоднасць, а ў другіх – вялікі плён, бо шмат ад авечак разнастайнага плёну – і воўна, і малако, і прыплод, чаго ад казлоў не бывае. Але жывёла прыбытковая ці непрыбытковая па прыродзе, а людзі – па добрай ахвоце, за што адныя мучацца, а другія – карануюцца.

Тых, што злева, мучыць няпраўда, таму Ён нават не спрачаецца з імі, але паставіўшы іх адразу, выказвае ім віну: Не далі мне есці і гэтак далей... Яны ж з пакорай адказваюць, але гэтая пакора не дае ім ніякай карысці. І не дзіва, бо такую каштоўнасць пры жыцці яны прамянялі на марнасць. Пра гэта ж і прарокі паўсюль казалі: “Міласці хачу, а не ахвяры”. І Заканадаўца ўсімі сіламі на гэта натхняў, ды й нават прырода гэта падказвала, што належыць уважліва захоўваць запаведзі.

Але наколькі ж шчаслівымі трэба назваць тых, каго Сам Айцец дабраславіў. <...> Гляньце ж, за што атрымліваюць гэты дарунак! За прыняцце жабрака, за кашулю, за хлеб, за ваду, за наведванне, за ўваходжанне ў вязніцу. А іншым сказаў: “Адыдзіцеся ад Мяне, праклятыя!” Не сказаў “праклятыя Айцом Маім!”, бо не Ён іх пракляў, але ўласныя іх справы. І не сказаў “у агонь вечны, для вас прыгатаваны”, таму што “прыгатаваны д’яблу і анёлам яго!”. “Бо Валадарства, – кажа, – прыгатаваў вам, а не агонь. Агонь жа не вам, але д’яблу і анёлам ягоным. Толькі вы самі сябе адлучылі, не накарміўшы і не наведаўшы. Самі сабе й віну напішаце”.